Лукашэнка: шукаць іншыя вэктары экспарту

Міністар Навумаў сышоў у адстаўку

Беларускія апазыцыянэры пазбавіліся замежнай фінансавай падтрымкі

«Беллегпрам»: запасы гатовай прадукцыі на прадпрыемствах — больш за 200%

Беларусы лічаць, што на іх шыі сядзіць занадта шмат чыноўнікаў

МТС нечакана загаварыў па-беларуску



photo.bymedia.net

6 красавіка Аляксандар Лукашэнка прыняў адстаўку міністра ўнутраных спраў Уладзімера Навумава. Афіцыйная вэрсія — «паводле стану здароўя» — выклікала ў большыні камэнтатараў сумневы. 53-гадовы Навумаў рэгулярна дэманстраваў прыхільнасьць да здаровага ладу жыцьця: пераадольваў спартовай хадой па сто кілямэтраў, нават зьбіраўся штурмаваць Эвэрэст — карацей, усяляк даводзіў, што ў яго зайздросныя фізычныя кандыцыі.

Сярод вэрсіяў сапраўдных прычынаў адстаўкі дамінуе наступная: такім чынам Лукашэнка хоча залагодзіць Эўропу. Навумаў быў апошнім на высокай пасадзе з тых дзяржаўных службоўцаў, што фігуруюць у нашумелым дакладзе дэпутата ПАРЭ Хрыстаса Пургурыдэса аб зьнікненьнях палітычных апанэнтаў беларускага рэжыму. Раней былі прыбраныя ў цень іншыя асобы, падазраваныя эўрапейскімі структурамі ў дачыненьні да гэтых зьнікненьняў і ўнесеныя Брусэлем у чорны сьпіс «неўязных»: Юры Сівакоў, Віктар Шэйман, Зьміцер Паўлічэнка.

«Афіцыйны кіраўнік адсоўвае з публічнай сфэры тых, хто правакаваў на Захадзе пытаньні на непрыемную тэму», — робіць выснову менскі аналітык Аляксандар Класкоўскі. Ён адзначае: «Непрымірымыя апанэнты рэжыму кажуць: гэта толькі замятаньне сьлядоў, бо самі зьнікненьні так і не расьсьледаваныя. Так, але тут трэба ўлічваць: эўрапейскія палітыкі ёсьць пераважна нэафітамі ў «беларускім пытаньні». Яны рэагуюць на тое, што рэжа вочы».

У сваю чаргу палітоляг Андрэй Ляховіч выказвае меркаваньне, што адстаўка Навумава «сьведчыць пра моцныя пазыцыі ў складзе кіроўнай эліты групаў, якія выступаюць за аўтарытарную мадэрнізацыю, за падкантрольную, павольную

палітычную лібэралізацыю». Ён мае на ўвазе групу Віктара Лукашэнкі — старэйшага сына прэзыдэнта і ягонага памочніка ў пытаньнях нацыянальнай бясьпекі, а таксама групу тэхнакратаў на чале з прэм'ер-міністрам Сяргеем Сідорскім.

«Яны ініцыявалі буйныя ратацыі ў складзе сілавых і кантрольных структураў, акрамя іншага і дзеля таго, каб правесьці наверх сваіх прызначэнцаў, — заўважае Ляховіч. — Значэньне сілавых (КДБ, МУС) і кантрольных (КДК, пракуратура) структураў у палітычнай сыстэме Беларусі памяншаецца. Яны знаходзяцца пад кантролем групаў, якія выступаюць за асьцярожныя, пралічаныя, але ўсё ж — зьмены ў Беларусі».

Ня меншы рэзананс, чым адстаўка Навумава, займелі на гэтым тыдні рэзкія выказваньні беларускага кіраўніка на адрас Масквы. 7 красавіка падчас паездкі па Гомельскай вобласьці Лукашэнка, у прыватнасьці, выказаў незадаволенасьць тым, што расейскі бок не выконвае дамоўленасьцяў датычна скасаваньня абмежаваньняў ва ўзаемным гандлі.

«Што тычыцца Расеі, то тут назіраюцца не зусім прыстойныя адносіны, — сказаў Лукашэнка. — І я не баюся пра гэта публічна абвесьціць». Яшчэ болей, ён загадаў падначаленым перастаць «поўзаць па расейскіх кабінэтах і на каленях перад імі стаяць. Ня хочуць нас пускаць на свае рынкі, мы будзем шукаць іншыя вэктары экспарту».

Але ўжо ў чацьвер, сустракаючыся з губэрнатарам Ленінградзкай вобласьці Валерыем Сердзюковым, Лукашэнка запэўніў, што «будучыні без Расеі мы ня бачым, мы асуджаны жыць разам з Расеяй». Назіральнікі робяць выснову, што такім чынам беларускі афіцыйны лідэр паспрабаваў зьмякчыць ранейшыя выпады на адрас Масквы.

Замежнапалітычную дактрыну Лукашэнкі беларускія аналітыкі называюць «тактыкай манэўровага паравоза». На іх думку, беларускі кіраўнік спрытна гуляе на супярэчнасьцях ды ўзаемных фобіях Масквы і Эўропы. Гэта рызыкоўная гульня, але іншага выйсьця ў Лукашэнкі няма, бо адысьці ад Расеі не выпадае праз моцную эканамічную залежнасьць. Звыш таго, Эўропа дапякае патрабаваньнямі ў галіне дэмакратыі ды правоў чалавека. Зь іншага боку, гульня на эўрапейскім кірунку дапамагае ўмацаваць пазыцыі ў супрацьстаяньні расейскаму ціску, адзначаюць незалежныя экспэрты.

Дарэчы, падчас паездкі па Гомельскай вобласьці 7 красавіка Лукашэнка прагаварыўся пра гэты ціск. Зь ягоных словаў, сваю згоду зьняць абмежаваньні ў пытаньні доступу беларускіх вытворцаў на расейскі рынак Масква абумоўлівае патрабаваньнем падзяліцца актывамі беларускіх прадпрыемстваў: «…Аддайце заводы, аддайце тое і гэта». Беларускі кіраўнік рашуча рэзюмаваў: «Не, сёньня ніхто ва ўмовах крызысу нічога за бесцань прадаваць ня будзе».

«Аднак ці надоўга хопіць пораху трымаць гэтую абарону?» — ставяць пытаньне незалежныя эканамісты. Яны адзначаюць: пад маркай «удакладненьня бюджэту» ўрад падрыхтаваў сэквэстар. Да гэтага змушаюць суворыя чыньнікі фінансава-эканамічнага крызысу: рэзка ўпаў экспарт, звузілася падатковая база.

Так, згодна з праектам, пра які днямі прэм'ер Сідорскі дакладаў прэзыдэнту, даходы кансалідаванага бюджэту краіны на 2009 год скарачаюцца ад 73,9 трлн. да 62,8 трлн. беларускіх рублёў. Яшчэ болей значна скарачаюцца бюджэтныя расходы.

Паводле разьлікаў Яраслава Раманчука, кіраўніка Навукова-дасьледчага цэнтру Мізэса, пры лёгка прагназаванай далейшай дэвальвацыі беларускага рубля даходная частка кансалідаванага бюджэту скароціцца ў даляравым эквіваленце на $15,8 млрд., або амаль што напалову. «З расходамі сытуацыя складваецца яшчэ болей драматычна: яны могуць зьменшыцца аж на 17 мільярдаў даляраў», — дадае экспэрт.

На думку шэрагу беларускіх аналітыкаў, Расея пастараецца скарыстаць фінансава-эканамічныя цяжкасьці Беларусі дзеля экспансіі свайго капіталу, накіданьня «фінансавай пятлі», а таксама выцісканьня палітычных саступак. Як зазначыў у інтэрвію «Радыё Свабода» палітоляг Вячаслаў Пазьняк, «усебаковы ціск з боку Масквы на Беларусь вельмі рызыкоўны. Працяг саступак у прэфэрэнцыях і продажы ўласнасьці расейскім партнэрам стварае рэальную пагрозу незалежнасьці Беларусі. Таму стаўкі вельмі вялікія. Тое, на што пойдзе цяпер афіцыйны Менск, будзе вызначаць дынаміку дачыненьняў на гады».

Тым часам стала вядома, што 10 красавіка Аляксандар Лукашэнка зноў ляціць у Маскву.

ПАЛІТЫКА

## Лукашэнка: шукаць іншыя вэктары экспарту


photo.bymedia.net

***Кіраўнік Беларусі Аляксандар Лукашэнка заявіў, што «трэба спыніць поўзаць на каленях па расейскіх кабінэтах».***

Падчас паездкі па Гомельскай вобласьці ён выказаў незадаволенасьць выкананьнем расейскім бокам дамоўленасьцяў па скасаваньні абмежаваньняў ва ўзаемным гандлі.

Ён заявіў, што калі Расея ня хоча пускаць Беларусь на свае рынкі, то трэба шукаць «іншыя вэктары экспарту». Паводле Лукашэнкі, у Расеі «больш несумленных адносінаў да нас».

«Так, мы не выбіраем газ, а нам прад'яўляюць штрафныя санкцыі. Дамовіліся па 150 даляраў за газ, іншыя прыяжджаюць і кажуць, што трэба больш», — сказаў кіраўнік краіны.

Ён заявіў, што ўзамен на зьняцьцё абмежаваньняў па доступе беларускіх вытворцаў на расейскі рынак Масква прапануе Беларусі падзяліцца сваёй уласнасьцю.

*Радыё Свабода*

АФІЦЫЙНА

## Міністар Навумаў сышоў у адстаўку


photo.bymedia.net

***Аляксандар Лукашэнка прыняў адстаўку міністра ўнутраных справаў.***

Навумаў папрасіў вызваліць яго з пасады паводле стану здароўя.

*Інтэрфакс*

АПАЗЫЦЫЯ

## Беларускія апазыцыянэры пазбавіліся замежнай фінансавай падтрымкі

***Беларуская апазыцыя адчувае фінансавыя цяжкасьці ў сувязі са спыненьнем паступленьняў з-за мяжы.***

Як заявіў намесьнік старшыні Партыі БНФ Віктар Івашкевіч, акцыі апазыцыі больш ня маюць фінансавай падтрымкі з боку замежных дзяржаў.

Паводле яго слоў, партыя ня можа забясьпечыць агітацыю перад вулічнымі акцыямі, а таксама мае праблемы з аплатай арэнды офіса. Івашкевіч адзначыў, што апазыцыйныя партыі разьлічваюць на «мабілізацыю сродкаў ад грамадзянскай супольнасьці».


photo.bymedia.net

Лідэр «Руху «За свабоду» Аляксандар Мілінкевіч пацьвердзіў, што замежныя партнэры фактычна спынілі фінансавыя адносіны зь беларускай апазыцыяй. На думку былога кандыдата ў прэзыдэнты, сродкі варта шукаць унутры краіны.

«Ёсьць нямала матэрыяльна забясьпечаных людзей, якія жадаюць зьменаў. Нам ужо аказваюць дапамогу. Праўда, выключна на ўмовах ананімнасьці», — адзначыў Мілінкевіч.

*Інтэрфакс*

ЭКАНОМІКА

## «Беллегпрам»: запасы гатовай прадукцыі на прадпрыемствах — больш за 200%


photo.bymedia.net

***Пра гэта паведаміў старшыня канцэрну Эдуард Нарышкін.***

«У цяперашні час запасы гатовай прадукцыі на прадпрыемствах «Беллегпраму» ў сярэднім складаюць крыху больш за 200%, — канстатаваў кіраўнік ведамства. — Скачок складскіх запасаў адбыўся ў пачатку 2009 году. У мінулым годзе ў сярэднім запасы гатовай прадукцыі да сярэднемесячнага аб'ёму вытворчасьці складалі 120-150%».

Эдуард Нарышкін паведаміў, што канцэрн падпісаў праграму сумесных дзеяньняў зь Міністэрствам гандлю, дзе, у прыватнасьці, прадугледжваецца больш адкрытая праца з аптовым гандлем. Усе прадпрыемствы канцэрну павінны даваць зьніжку ў 8%. Таксама, у выпадку прапановаў гандлёвых арганізацыяў зьнізіць кошты на прадукцыю, прадпрыемствы робяць беспрэцэдэнтныя ўцэнкі. Напрыклад, пінскае «Палесьсе» зьнізіла кошты на некаторыя віды сваёй прадукцыі на 70% і па выніках двух месяцаў выйшла на прыбытковую працу.

*БелаПАН*

ГРАМАДЗТВА

## Беларусы лічаць, што на іх шыі сядзіць занадта шмат чыноўнікаў

***Больш за 70 адсоткаў жыхароў Беларусі лічаць, што дзяржапарат можна было б і паменшыць.***

Пры гэтым, паводле вынікаў дасьледаваньня цэнтру «Люстэрка-Інфо», 49 адсоткаў апытаных хацелі б, каб шэрагі чыноўнікаў значна парадзелі. Беларусы лічаць, што гэта дапаможа зьмякчыць удар эканамічнага крызысу. А вось за тое, каб заклікаць на дзяржаўную службу дадатковых працаўнікоў, ня выказаўся ніхто. Дарэчы, сярод удзельнікаў дасьледаваньня было 4 адсоткі чыноўнікаў.

Пры гэтым большасьць апытаных (44%) ня верраць у тое, што працаўнікі беларускіх міністэрстваў і ведамстваў здольныя адмовіцца з-за крызісу ад часткі свайго заробку. Так, нагадаем, некалькі месяцаў таму паступілі дзяржаўныя службоўцы суседняй Латвіі.

*Комсомольская правда в Беларуси*

КУЛЬТУРА

## МТС нечакана загаварыў па-беларуску


photo.bymedia.net

***Цяпер, калі абанэнт недаступны, аўтаадказьнік кампаніі МТС паведамляе пра гэта на трох мовах. Да расейскай і ангельскай дадалася беларуская: «Тэлефон абанэнта выключаны ці знаходзіцца па-за межамі дзеяньня сеткі».***


photo.bymedia.net

А яшчэ 6 красавіка актывісты «Маладога фронту» і «Моладзі БНФ» атрымалі адказ ад адміністрацыі кампаніі МТС пра тое, што пакуль няма фінансавых сродкаў, каб перакласьці аўтаадказьнік даведкі на беларускую мову.

Раней маладыя людзі перадалі кампаніі прапанову ўжываць беларускую мову. Пад лістом падпісаліся больш за дзьве з паловай тысячы чалавек.

Адмоўны адказ выклікаў розгалас у інтэрнэце. Маладыя людзі выказвалі меркаваньне: маўляў, сапраўдная прычына адмовы — тая, што галаўны офіс кампаніі знаходзіцца ў Расеі.

Цікава, што фінансавую праблему кампанія вырашыла літаральна цягам сутак.

Моладзевыя актывісты лічаць гэта адной са сваіх перамогаў у змаганьні за родную мову.

*Радыё Свабода*

CENTRUM STOSUNKÓW MIĘDZYNARODOWYCH
CENTER FOR INTERNATIONAL RELATIONS

БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ

EUROPEAN RADIO FOR BELARUS

польская дапамога

There are various sites devoted to events in Belarus, which are, however, little known in Western Europe, and among people dealing with politics towards Belarus who do not understand the Russian or Belarusian languages.

The site belarus-live fills this gap. The site allows to order weekly reception of news in English, Polish, Belarusian, Russian.